УДК 371.3

## ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВУЧНЯЎ У КАНТЭКСЦЕ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ ПРАЗ ВЫХАВАННЕ ЛЮБВІ І ПАВАГІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

*Алянюк Галіна Анатольеўна*
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 1 г. Бялынічы імя М. І. Пашкоўскага”
(г. Бялынічы, Рэспубліка Беларусь)

*У дадзеным артыкуле раскрыта важнасць фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму навучэнцаў з мэтай выхавання павагі да гісторыі і культурных традыцый беларускага народа, духоўна багатай асобы з пачуццём адказнасці за будучыню роднай зямлі.*

Гісторыя – гэта наша мінулае. Але, як вядома, без мінулага няма сучаснасці і будучыні. Нябачная, але трывалая нітка звязвае мінулае і сучаснасць, адно пакаленне людзей з другім. Гэтая нітка будзе трывалай да таго часу, пакуль мы з вамі памятаем пра наша мінулае, ведаем сваю гісторыю.

Чалавек, які любіць і шануе сваю Радзіму, павінен ведаць пра яе ўсё, каб расказаць будучым пакаленням, хто яны такія і адкуль узяліся на зямлі. Сення мы звяртаемся да тэмы спадчыны, уласнай гістарычнай памяці, згадваем паймення сваіх папярэднікаў, аднаўляем парушаную жыццёвую гармонію, каб не забыць, што кожны з нас – часцінка свайго народа і той зямлі, якая завецца Бацькаўшчынай. Мы зноў і зноў вяртаемся да гісторыі сваёй Радзімы для таго, каб яшчэ больш шанаваць і любіць яе, паважаць яе народ. Беларуская зямля шчодрая на прыгажосць прыроды, працавітых і мужных людзей, намаганнямі якіх створана галоўнае багацце: гарады, пасёлкі, вёскі. У кожнага з населеных пунктаў свая культура, гісторыя, традыцыі, поспехі і праблемы.

Менавіта ў навучальнай установе вучні атрымліваюць, паглыбляюць веды пра гістарычную мінуўшчыну нашай роднай зямлі, звычаі і традыцыі продкаў, знаёмяцца і сустракаюцца са знакамітымі землякамі. Мэтай навучання ў школе з’яўляецца “фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, інтэлектуальнае, духоўна-маральнае, творчае, фізічнае і прафесійнае развіццё асобы навучэнца, фарміраванне ў яго ведаў, уменняў, навыкаў і кампетэнцый” [1, с. 9].

Трэба зазначыць, што адна з важных задач выхавання – “фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі” [1, с. 5]. Галоўнымі аспектамі выхавання з’яўляецца “грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму. Асноўнымі складнікамі выхавання з’яўляюцца: ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў асноў дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццё падрастаючаму пакаленню агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцяў, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці; грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры [1, с. 16].

Школьнае асяроддзе – гэта асяроддзе, у якім непасрэдна фарміруецца асоба творчая, адказная. На вучэбных занятках, у пазаўрочны час праца настаўніка накіравана на фарміраванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, развіццё ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці і актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Для нас, настаўнікаў, і нашых вучняў Бацькаўшчына – гэта горад Бялынічы. Яго ваколіцы – прыгожыя куткі Прыдруцкага краю, чароўныя і маляўнічыя мясціны. Яны з любоўю апеты ў многіх творах Віктара Хаўратовіча, Алега Пліндова, Змітрака Марозава, Алы Войлакавай і іншых паэтаў Бялынiччыны.

Школа працягвае традыцыі вядомых землякоў. У ракурсе выхавання нацыянальнай самасвядомасці ў школе вытрымана знешняе афармленне, арганізавана работа літаратурна-краязнаўчага і гісторыка-краязнаўчага музеяў, работа кабінета – імправізацыі “Вясковая школка пачатку ХХ стагоддзя”, літаратурная творчасць вучняў і настаўнікаў.

Для кожнага чалавека радзіма пачынаецца з любові да тых месцаў, дзе нарадзіўся і жывеш. Але проста любіць родную зямлю недастаткова. Неабходна ведаць гісторыю, культуру, звычаі, паверʼі свайго запаветнага кутка, вядомых землякоў. У школьнікаў павінна развівацца пачуццё патрыятызму, гонару за сваю малую радзіму. Адной з важных задач педагогаў школы з’яўляецца выхаванне грамадзяніна, патрыёта, які любіць, шануе, вывучае свой родны край, сваю зямлю.

Сама абстаноўка ў школе, афармленне стэндаў аказваюць непасрэдны ўплыў на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму школьнікаў, паважлівага стаўлення да дзяржаўнай сімволікі.

У фае нашай установы адукацыі размешчаны інфармацыйна-прапагандысцкі стэнд “Квітней, Беларусь” (дзяржаўная, абласная, раённая сімволіка), стэнд “Наша жыццё” (“Школьная сімволіка”, “Галерэя талентаў”). Тут жа знаходзіцца стэнд “Выхаванне патрыятызму, любові да малой Радзімы”, дзе размясціліся школьныя друкаваныя выданні: зборнікі творчых работ навучэнцаў “Жыцця круг”, біяграфічна-пазнавальныя альманахі “Песняры зямлі беларускай”, літаратурна-ілюстрацыйныя зборнікі “Наша спадчына” і “Родныя краявіды”, газета юных літаратараў “Пралеска”, газета “Мы і час”.

Важна адзначыць выхаваўчую ролю ў фарміраванні грамадзянскай пазіцыі і патрыятычных пачуццяў вучняў школьных музеяў (літаратурна-краязнаўчага “Спадчына” і гісторыка-краязнаўчага).

У літаратурна-краязнаўчым музеі сабраны і сістэматызаваны матэрыял пра пісьменнікаў Прыдруцкага краю, які выкарыстоўваюць ў сваёй рабоце настаўнікі. Асноўныя кампазіцыі музея раскрываюць здабыткі нашых продкаў, дапамагаюць фарміраваць каштоўнасныя адносіны да гісторыі і культуры роднага краю. На базе музея з мэтай папаўнення музейных матэрыялаў арганізавана даследчая дзейнасць. Групы з вучняў-старшакласнікаў атрымліваюць заданні: наведаць мясцовых пісьменнікаў, пагутарыць, зрабіць адпаведныя запісы, набыць цікавы матэрыял пра іх жыццёвы і творчы шлях. Значную дапамогу ў гэтым напрамку аказалі члены літаратурнага аб’яднання “Натхненне” пры раённай газеце “Зара над Друццю” Алег Пліндоў і Мікалай Падабед.

**Асноўныя раздзелы экспазіцыі музея** “Пісьменнікі Прыдруцкага краю”, “Краязнаўства”, літаратурнае аб’яднанне “Натхненне”, “Каласкі маладых” дазваляюць пазнаёміць нашых

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навучэнцаў з развіццём літаратуры на Бялынiччыне, развіваць творчыя і арганізатарскія здольнасці вучняў.

Музей мае бібліятэку, дзе захоўваюцца мерапрыемствы вечарын, гасцёўняў, папкі літаратурнага аб'яднання "Сцяжынкамі натхнення".

Савет музея вядзе перапіску з земляком, паэтам-франтавіком Алегам Пліндовым, які пражывае ў Гомелі. Дзякуючы яго лістам, успамінам ёсць магчымасць прасачыць тэму Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці паэтаў-землякоў.

Літаратурныя сустрэчы з Міколам Падабедам, членам Саюза журналістаў Беларусі, членам Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, даюць уяўленне аб літаратуры ў жанры гумару.

Гутаркі, інтэрв'ю з рэдактарам раённай газеты "Зара над Друццю"_Міхасём Карпечанкам з'яўляюцца частымі формамі работы Савета музея. Як вядомы краязнаўца, ён знаёміць з напрацоўкамі з архіўных дакументаў. Савет музея сабраў багаты матэрыял рубрыкі "Бялынiччына літаратурная".

На базе літаратурна-краязнаўчага музея "Спадчына" і працуе літаратурна-краязнаўчае аб'яднанне "Сцяжынкамі натхнення".

Дзейнасць літаратурна-краязнаўчага музея "Спадчына" дазваляе вучням, арыентаваным на навуковую працу, ствараць літаратурныя партрэты мясцовых пісьменнікаў; вучням, арыентаваным на прафесію журналіста, на працу з інфармацыяй, – працаваць у выданні школьнай газеты "Пралеска", альманаха "Наша спадчына" і зборнікаў творчых работ вучняў, удзельнічаць у падрыхтоўцы літаратурных вечарын, паэтычных гасцёўняў, вечароў-успамінаў, рыхтаваць вусныя часопісы па тэме заняткаў, а затым выступаць перад вучнямі малодшых класаў, праводзіць для іх экскурсіі; для асобай катэгорыі вучняў, чые інтарэсы ляжаць у сферы тэатральнага мастацтва, наладжваць тэатралізаваныя прадстаўленні.

З вялікім задавальненнем і адказнасцю ўдзельнікі літаратурна-краязнаўчага аб'яднання "Сцяжынкамі натхнення" рыхтуюць і паказваюць на сцэнах школы, раённага Цэнтра культуры, Дома для састарэлых і інвалідаў п'есы беларускіх драматургаў, фальклорныя святы, што садзейнічае духоўнаму станаўленню асобы, больш глыбокаму ўспрыняццю нацыянальных каштоўнасцей і традыцый беларускага народа, фарміраванню грамадзянска-патрыятычных пачуццяў.

Выхаванню пачуцця дачынення да мінулага і сучаснага, адказнасці за будучае спрыяе выкарыстанне гісторыка-краязнаўчага музея, які адкрыты ў школе 8 мая 1984 года да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыя музея змяшчае гістарычныя матэрыялы Бялынiччыны.

Найбольш каштоўнымі экспанатамі краязнаўчай экспазіцыі з'яўляецца кніга "Падарожжа ў Татарыю" 1804 г., часопісы "Ніва" (№ 26 за 1899 г. і № 4) за 1900 г., карта Старажытнай Польшы 1859 г. У музеі захоўваюцца дакументы, звязаныя з перапіскай ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, лісты, выпіскі з архіваў.

Матэрыялы з музеяў з'яўляюцца каштоўным сродкам фарміравання ў нашых вучняў грамадзянскай пазіцыі, любві да роднай зямлі, гонару за нашых землякоў, беражлівых адносін да спадчыны бацькоў.

Краязнаўчая работа, арганізаваная ў школе, мае важнае выхаваўчае значэнне ў станаўленні грамадзянскай пазіцыі нашых вучняў, фарміраванні ў іх павагі і пашаны да здабыткаў беларускага народа, спрыяе выхаванню зычлівасці, спагадлівасці, высакароднасці.

У музеі ёсць стэнд "Бялыніцкі манастыр", дзе сабраны матэрыялы пра гісторыю стварэння манастыра, паказана гісторыя з'яўлення абраза Бялыніцкай маці Божай, паведамленні аб цудоўным аздараўленні ад абраза Бялыніцкай маці Божай, адкрыццё царквы іконы Бялыніцкай Божай маці.

У раздзеле "Наш край" у гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны" прадстаўлены фотаздымкі ўдзельнікаў падзей 1917 года.

Самы вялікі раздзел музея прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Гэты раздзел прадстаўлены наступнымі экспазіцыямі: "У год 41-ы", матэрыялы аб пачатковым этапе вайны, пра подзвіг Б. Хігрына, "Падполле Бялыніч", прадстаўлены фатаграфіі партызан і падпольшчыкаў Бялыніцкага раёна.

Праца па фарміраванні любві да малой радзімы, выхаванне ў вучняў цікавасці да яе гісторыі арганічна ўключаецца ў вучэбны працэс. На базе музея праводзяцца ўрокі гісторыі, грамадазнаўства, літаратуры, мовы, выхаваўчыя мерапрыемствы. Гэта дазваляе рэалізаваць маральна-этычны патэнцыял асобы навучэнцаў: успрыманне і разуменне такіх каштоўнасцей, як сям'я, школа, сяброўства, радзіма, краіна.

Такім чынам, можна з упэўненасцю адзначыць, што дадзеная работа фарміруе ў вучняў пачуццё асабістай адказнасці за свае паводзіны і ўчынкі, развівае пачуццё патрыятызму і гонару за свой родны край, прывівае любоў і павагу да роднай беларускай зямлі, да мовы і культуры беларускага народа, развівае цікавасць да фальклорнай спадчыны, спрыяе фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Об изменении Кодекса Республики Беларусь об образовании : Закон Республики Беларусь, 14 января 2022 г., № 154-З : принят Палатой представителей 21 декабря 2021 г. : одобр. Советом Республики 22 декабря 2021 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова